Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 6. (505) Вільня, Нядзеля 5 Лютага 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

"Бел КРЫНІЦА" каштуе на год — 4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

70-лецьце беларускай прэсы.

(*„Mužyckaja Praŭda“ 1863 h.*).

З пачаткам XIX в. у Эўропе ў літэратуры і ў навуцы паявіўся кірунак думкі людзкой, празваны романтызмам. Сутнасьць яго ў тым, што ён — як-бы пратэстуючы процiў сухога і бяздушнага клясыцызму, каторы нядацэніваў асабістага, унутранага жыцьця адзінак людзкіх і народаў — зварочваў прадусім увагу на асабістасьць чалавека, на яго пачуцьцё і выабразьню, а так-жа на мінуўшчыну народаў і на іх унутранае жыцьцё.

Романтызм такім чынам — гэта духовы бацька адраджэньня народаў, гэта духовы бацька імкненьня гэтых народаў да выяўленьня сваей нацыянальнасьці, да яе разьвіцьця і ўцьвярджэньня. Працэс нацыянальнага адраджэньня і нацыянальнага жыцьця народаў у Эўропе, пачаўшыся ў пачатку XIX ст., адбываецца й сяньня, духам сваім абняўшы ўжо і другія часьці сьвету.

Зярняты нацыянальных ідэяў, зроджаныя романтызмам, дзякуючы францускай рэвалюцыі, наполеонскім войнам, а так-жа дзякуючы стычнасьці з Эўропай асьвечаных клясаў нашага краю, дакаціліся і да Беларусаў. Дасканальным праваднікам гэных ідэяў у нас быў да свайго закрыцьця (1832 г.) Віленскі ўнівэрсытэт.

З муроў гэтага ўнівэрсытэту, дзякуючы ягоным уплывам, паявіліся беларускія романтыкі, што пісалі беларускія вершы: Ян Баршчэўскі, Ал. Рыпінскі, Ян Чэчат і бацька беларускага краснага пісьменства Вінц. Дунін-Марцінкевіч.

З муроў гэтага-ж унівэрсытэту, або пад яго ўплывам, паявіліся беларускія романтыкі так-жа і ў навуцы, якія навукова дасьледжвалі беларускую гісторыю, права, мову. Да гэткіх належаць: уніяцкія сьвяшч. — праф. М. Бабровскі, Платон Сасноўскі, праф. Ігнат Даніловіч, Яз. Ярашэвіч і інш.

Гэны беларускі романтызм у літэратуры і ў навуцы на беларускую, ім-жа зроджаную, нацыянальную ідэю меў вялізарны ўплыў. Пад яго павевам ідэя гэта расла, крэпла і прыбірала штораз выразьнейшыя формы. Урэшце, у другой палове XIX в., беларуская нацыянальная ідэя пачала ужо строіцца ў соцыяльна-палітычную беларуска-народную вопратку. Быў гэта беларускі романтызм палітычны. На чале гэтага нашага палітычнага романтызму стаў ведамы беларускі народны змагар — Кастусь Каліноўскі, які, для выяўленьня грамадзкіх думак, выдаваў першую беларускую часопісь „Mužyckaja Praŭda“, а так-жа цэлы рад розных іншых беларускіх друкаў.

Кастусь Каліноўскі радзіўся 1838 г. у фальв. Мастаўлянах, Ялаўскай парафіі, Ваўкавыскага пав. Паходзіў з дробнай беларускай спольшчанай шляхты. Вучыўся сьпярша ў Сьвіслачы ў гімназіі, а пасьля ў Пецярбурскім унівэрсытэце, дзе скончыў права. Будучы ў Пецярбурзе К. К. быў пад уплывам расейскай часопісі „Колокол“, якая выходзіла ў Лёндыне пад кіраўніцтвам ведамых расейскіх эмігрантаў Гэрцэна і Бакуніна. „Колокол“ горача падтрымоўваў незалежнасьць Польшчы, засьцерагаючыся адначасна, каб адроджаная Польшча, прыгарнуўшы землі Вял. Кн. Літоўскага, ня здумала рабіць таго з Беларусамі, Літвінамі і Украінцамі, што з імі рабіла Расея, гэта знача, каб з народаў гэтых Польшч не рабіла жыру для сваей нацыянальнай і соцыяльнай забор-часьці.

Надта магчыма, што знаўся Каліноўскі так-жа з патрыярхам беларускага адраджэньня Фр. Багушэвічам, з якім быў у вадным часе ў Пецярбурскім унівэрсытэце, а магчыма так жа, што знаў і слаўнага ўжо тады украінскага паэта Шэўчэнку, які ў 1857-9 годзе, вярнуўшыся з сылкі, прабываў у тымжа Пецярбурзе.

У 1863 г. выбухла польскае паўстаньне, абняўшы так-жа і беларускія землі. Прыняў у ім удзел Багушэвіч, а так-жа і Каліноўскі, які ў паўстаньні адыграў асаблівую ролю. Польскае паўстаньне Каліноўскі думаў выкарыстаць ня толькі процiў Расеі, дзеля чаго яно й было арганізавана, але так-жа й процiў польскіх паноў, здабываючы для беларускага народу зямлю, а так-жа правы соцыяльныя, і палітычна-народныя. Як польскія гісторыкі, так і расейскія, К. Каліноўскага называюць сэпаратыстам, падчырківаючы яго імкненьне да стварэньня з зямель бышага Вял. Кн. Літоўскага самастойнай дзяржаўнай адзінкі, у саюзнай лучнасьці з Польшчай. Асабліва ярка гэткія ідэі праявіліся ў Каліноўскага, калі ён усё кіравецтва паўстаньнем у Беларусі і Літве забраў у свае рукі, аб'яўляючы сябе дыктатарам краю.

Кіруючы такім чынам паўстаньнем на беларускіх і літоўскіх землях, К. Каліноўскі адначасна вёў за свае гэныя ідэалы упорыстую барацьбу з польскай паўстанчай арганізацыяй, у якой пераважалі паны і якія край наш уважалі за звычайную польскую правінцыю.

Падтрыманьня на здабыцьцё магчымасьці ў той час самабытнасьці беларускаму народу і агулам усяму нашаму краю, К. Каліноўскі шукаў не ў паноў, але ў сялян. На іх ён пакладаў усе свае гэныя вялікія надзеі, да іх адклікаў я аж да самай сваей сьмерці, якая наступіла 10 (22) сакавіка 1864 г., калі малады, бо толькі 26 гадовы, дыктатар наш быў агентамі Мураўёва злоўлены і павешаны ў Вільні.

Дзеля гэтых-жа вялікіх самастойніцкіх для краю мэтаў К. Каліноўскі першы выдаваў беларускую газэтку. Назваў ён яе „Мужыцкая Праўда“. Назоў яе сам за сябе гавора. Часопісі гэтай вышла нешта 6—7 нумароў. Друкавана яна лацінкай, пісана чыстай, з асаблівасьцямі Горадзеншчыны, беларускай мовай. Як „Мужыцкую Праўду“, так і адозвы свае, пісаныя пабеларуску, падпісваў Каліноўскі сваей мянюшкай Яська Гаспадар з-пад Вільні. Зьмест часопісі бадай цалком пасьвячаны заклiку Беларусаў да барацьбы з маскоўскім панаваньнем дзеля здабыцьця для іх зямлі і грамадзкіх правоў. У бок Польшчы — відаць дзеля тактыкі — спатыкаюцца ў гэтай часопісі даволі частыя і як на наша сяньнешняе разуменьне — завялікія пахвалы.

У кожным выпадку «Мужыцкая Праўда» зьяўляецца першай беларускай часопісяй, якая, хоць выходзіла нерэгулярна, бо была газэтай падпольнай, усёж-дыкі паказалася на сьвет у якіх шасьцёх, ці сямёх нумарох.

Такім чынам „Mužyckaja Praŭda“ гэта казаў-бы матка беларускай прэсы, усіх беларускіх газэт і журналаў, якія ад 1863 г. да нашых дзён вышлі ў сьвет і якія выходзяць сяньня.

У сёлетнім годзе ад часу выхаду „Mužyckaj Praŭdy“ мінае 70 гадоў. Юбілей гэты дарагі нам і важны. Астаецца толькі пажадаць, каб беларускае грамадзянства, асабліва студэнская моладзь, належна юбілей гэты адсьвяткавала ды яшчэ больш яго пазнала. Справа ў тым, што як сама „Mužyckaja Praŭda“, так і асоба яе рэдактара К. Каліноўскага, а так-жа праўдзівы характар і матывы яго дзейнасьці агулам дужа мала ведамы. Але ў кожным выпадку К. Каліноўскі гэта вялікі беларускі сялянска-палітычны народны барацьбіт і знаць яго беларусам трэба, як належыцца.

Амэрыканскае „дзіва“

Сьвет прывык ставіць Амэрыку ўва ўсім у прыклад. То-ж што ня сталася вялікага, усё гэта сталася ў Амэрыцы: у Амэрыцы найскарэйшыя і найсільнейшыя машыны, у Амэрыцы найбольшыя, найвышэйшыя дамы, у Амэрыцы найбагацейшыя людзі, у Амэрыцы ўсялякія дзівы... ня толькі „дадатныя,“ але і адʼемныя. Сягоньня не сакрэт, што зладзействы і звычайны бандытызм амэрыканскі (справа дзіцяці Ліндбэрга!) ня маюць бадай у сьвеце сабе роўных. Апошнім аднак сапраўды амэрыканскім рэкордам (перавышэньнем іншых) ёсьць амэрыканскае безрабоцьце, якое ў лічбах перавышае ўсё дагэтуль чутае: 10.000.000 чалавек бяз працы. Дзесяць мільёнаў!

Але і ня ў тым самое„дзіва,"што гэтыя безработныя ў Амэрыцы ёсьць — гдзе іх сягоньня няма? — але дзіва ў тым, што яны, апынуўшыся бяз працы, робяць, з чаго жывуць? Ці яны жабруюць, ці дабіваюцца помачы ад сваей найбагацейшай у сьвеце казны, ці безнадзейна мруць ад голаду і холаду?.. За далёка ад нас гэта Амэрыка, каб дакладна аб ёй усё ведаць. Апошнім часам аднак коопэратыўныя і гаспадарчыя часопісі— а між імі і беларуская „Самапомач“ у № 1 (4) — прынясьлі вельмі цікавую вестку з амэрыканскага надморскага места Сітль.

Жыхары гэнага места,апынуўшыся бяз працы і якіх-небудзь іншых спосабаў да жыцьця—Амэрыка страхоўкі ад безробоцьця ня знае,— ня шукалі „збавенных“ рэцэптаў палітычнага радыкалізму, не аглядаліся, покуль нехта са стараны прыйдзе ім памагаць, але самі сарганізаваліся ў „Лігу (зьвяз, саюз) безработных." І тут вось пачалося тое сапраўднае „амэрыканскае дзіва:“ Ліга ня трубіла на ўвесь сьвет, што дасьць сваім сябрам работу і хлеб, не рабіла на сяброў „аблавы“ і аднак у хуткім часе лічыла іх аж 40.000 (сорак тысяч) чалавек. Усіх гэтых людзей злучыла не абяцанка атрыманьня запамогі са стараны, бо з некуль было яе дастаць: гэтых людзей злучыла сьвядомая вера ў свае собскія сілы.

Праца ня можа гінуць безкарысна; калі-ж яна людзям не забясьпечвае часам жывабыту, дык гэта знак, што нейдзе разарваўся той жывы ланцуг, па якім услугі(праца) аднэй часьці людзкасьці перадаюцца для часьці другой і наадварот. Зьвязаць гэты ланцуг нанова, узалежніць цесна існаваньне аднэй часьці людзей ад часьці другой, гэта тоесамае, што вярнуць людзям хлебадайную працу, вярнуць пэўнасьць, лад і супакой.—Але як гэты парваны ланцуг зьвязаць?

Вось-жа безработныя жыхары м. Сітль, ня маючы нічога, апрача пары рук і добрай волі самым сабе памагчы, пачалі, як кажуць, „ад абуха.“ Яны перадусім пастанавілі забясьпечыць сабе супольны кусок хлеба: хто ўмеў—заняўся рыбалоўствам, хто дастаў працу сабраць з прасторных палёў пакінутыя зямляплоды, ізноў хто іншы пайшоў на лясныя работы і г. д. Уся гэта праца не аплачвалася капіталістычным прадпрыемствам пры сыстэме працы наёмнай, але для безработных яна запэўняла скромнае бытаваньне з супольнага катла. З гэтага пачалося.

24 1098

Пасьля, рамесьнікі ажывілі пакінутыя майстэрні, а збыт для сваіх вырабаў яны знайшлі ў акружаючых земляробскіх фэрмах (хутарох). Але ўжо не на грошы, а на земляробскі прадукт: муку, бульбу, мяса, малако, яйкі і г. д. Пачалося новае жыцьцё, жыцьцё на пачатак незавіднае, але і незалежнае ад здрадлівага граша. Што зрабілі безработныя м. Сітль, тое нападобілі іншыя месты, а вясной леташняга 1932-га году ўсе яны выслалі сваіх дэлегатаў на зьезд у Вашынгтон, гдзе між іншым абвесьцілі, што ўстанаўляюць заменны гандаль між местам і вёскай.

Як ўсё гэта будзе разьвівацца далей, трудна прадбачыць. Сягоньня можна толькі сказаць, што выхад з гаспадарчага крызысу трэба шукаць перадусім у працы гаспадарчай. Спосаб гэтай працы таксама выясьняецца: капіталістычныя формы гаспадаркі ня вытрымалі агнёвай пробы сучаснага крызысу, яны валяцца. А на іхным мейсцы родзяцца „новыя“ формы грамадзкае самадапамогі, справядлівае узаемнае самапомачы.

Гэта самапомач прад 80-цю гадамі апраўдалася ў Эўропе, сягоньня пацьвердзіла яе Амэрыка.—Слушным дзеля гэтага здаюцца быць словы „Самапомачы“, што „там, гдзе з трэскам валіцца самабойчы капіталізм, гдзе ні да чога не даводзіць узаемнае пераліцытоўваньне ў палітычным „радыкалізьме“, там родзіцца і ратуе людзей коопэратыўная самапомач. У гэтым яе выжшасьць прад усімі ведамымі гаспадарча-грамадзкімі сыстэмамі, у гэтым яе сіла і ў гэтым зарука яе перамогі.“

Каб-жа гэта ды хутчэй і ў нас сталася!

Р.

Школа ў Польшчы.

Аб нутранай палітыцы польскага ўраду, выяўленай міністрам Перацкім прад соймувай бюджэтнай камісіяй, мы пісалі ў прошлым нумары „Бел Крыніцы“.

Прад гэтай-жа камісіяй мін. асьветы Енджэевіч, гаворачы аб школьніцтве агулам, выявіў і палітычнае намераньне ўраду да школьніцтва народных меншасьцяў у Польшчы.

Міністр Енджэевіч заявіў, што намечанай праграмы працы ў школьніцтве ня зьменіць.

„Позытыўныя адносіны да польскай дзяржаўнасьці.“ З прамовы мін. Енджэевіча агулам аб школьніцтве ў Польшчы, цікавы для нас словы яго аб школьніцтве для народных меншасьцяў. Ён заявіў: стаю цьвёрда на грунце вымаганьня констытуцыі і школьных законаў. Дзеля гэтага з націскам мушу сказаць, *што ў школьніцтве народных меншасьцяў буду ставіць вымаганьне ня толькі вонкавай лёяльнасьці, але так жа позытыўных адносін да польскай дзяржаўнасьці, а тыя школы, у якіх гэтых позытыўных адносін ня будзе, мусяць адчуць у прыкры спосаб гэту недастачу.*

Як маюць праяўляцца гэтыя „позытыўныя“ адносіны, якой меркай і хто гэта будзе мераць — міністр Енджэевіч не сказаў.

Паўмільёна дзяцей бяз школы. Паводле заявы мін. Енджэевіча, у сёлетнім годзе школьнай навукі ёсьць у Польшчы 458.000 дзяцей, якія ня маюць дзе вучыцца. У будучым 1933-34 школьным годзе гэты лік дзяцей бяз школы міністр спадзяецца, што узрасьце да паўтара мільёна.

Расейская мова ў польскай школе. У дыскусіі над бюджэтам Міністэрства Асьветы мін. Енджэевіч заявіў, што навучаньне расейскай мовы будзе ўведзена, як прадмет абавязкавы ў гандлёвых школах, каб гаспадарчая сувязь Польшчы з Расеяй была інтэнсыўнейшай; у іншых школах, а іменна ў сярэдніх, будзе заведзена навучаньне якойсьці аднай славянскай мовы, а дзеля гэтага ў першую чаргу мовы расейскай.

Беларускага Школьніцтва зусім няма.

(*Прамова пасла Ярэміча паводле стэнаграмы*)

„Цяперашні міністр ёсьць грабаром беларускага школьніцтва. Урады Хіена-Пяста ня мелі адвагі ліквідаваць прынамсі прыватнага школьніцтва; у 1932 г. ня мелі мы ўжо аніводнай народнай беларускай школы і ніводнай гімназіі, тады калі ў 1925 г. мелі мы яшчэ 4 свае гімназіі і некалькі дзесяткаў народных школ. Народнае школьніцтва зьліквідавалі ўтраквізмам, дзьве гімназіі закрылі пад закідам камунізму і „нізкага роўню“ навучаньня — замест каб той ровень падняць. Астаткі скасавалі подступам: стварэньнем філіяў пры польскіх гімназіях у Вільні і Навагрудку, замест даць нам хоць-бы народнае 6-клясавае школьніцтва і абяцаныя беларускія ліцэі. Адзіную прыватную школу ў Браслаўскім павеце зьліквідавалі ў гэтым годзе ў такі спосаб, што вучыцельцы не далі пасьведчаньня моральнасьці і лёяльнасьці. Фактычным куратарам беларускіх школ быў начальнік аддзелу бясьпечнасьці.

Далей пас. Ярэміч зварочвае ўвагу: Пас. Луцькый жаліцца ў гэтай камісіі на „шпікоў“ сярод гімназіяльнай ўкраінскай моладзі. Я знаю, што тое самае дзеецца і ў нас— ёсьць „шпікі“ платныя, аб гэтым ведае кожны вучань, пэдагагічная рада, бацькаўскі камітэт. (Міністр Енджэевіч: „Гэта няпраўда“) Ярэміч: Падам прозьвішча.(Міністр Енджэевіч: Гэтага мала, прашу доказаў“). Ярэміч: Дам доказы. Што да вышэйшага школьніцтва, дык ні адзін беларускі селянін, нават найбагацейшы, а ў нас ёсьць толькі сярэдня заможныя сяляне, ня можа пасылаць дзяцей у сярэднюю школу і ўнівэрсытэт. Цяпер наша моладзь вандруе праз зялёную граніцу і наш інтэлігент выхоўваецца ў Саветах, але які ён вернецца. Пэўне-ж ня будзе выхаваны ў такім дусе, у якім жадае сабе п. міністр.“

Пагроза адарваньня Радавай Украіны ад Расеі.

У Радавай Украіне насьпяваюць вялікія падзеі. Тэлеграмы прыносяць трывожныя для Масквы весткі. З Масквы падаюць аб вельмі цікавых падзеях. Там адбывалася паседжаньне поўнага цэнтральнага выканаўчага камітэту камуністычнай партыі, які складаецца з прадстаўнікоў ад кожнай аўтанамічнай краіны С.С.Р.Р. Радавая Украіна мае ў гэтым камітэце 15 дэлегатаў.

Украінская група, у паразуменьні з урадам Савецкай Украіны, прад цэлым камітэтам прачытала сваю заяву, у якой абвінавачвае асабіста Сталіна, савецкі ўрад у Маскве і павадыроў камуністычнай партыі, за тое, што яны сыстэматычна безпрарыўна і ў немагчымы спосаб ломяць канстытуцыю, якую падпісалі ўсе саюзныя савецкія рэспублікі і каторая забясьпечвае Украіне аўтаномнае жыцьцё.

Далей, у заяве сказана так: Калі і далей кіраўніцтва камуністычнай партыі і савецкі ўрад у Маскве будуць праводзіць сваю палітыку, нарушаючы нацыянальныя і гаспадарчыя інтарэсы Украіны, дык Радавая Украіна будзе мець вольную руку ў далейшым паступаньні.

Пасьля прачытаньня гэтай заявы, камуністычныя ўлады зараз жа арыштавалі ўсіх 15 украінскіх прадстаўнікоў і пасадзілі іх у вастрог. Вінавацяць іх за тое, што хочуць адарваць Украіну ад Расеі. Гэта выклікала вялікае заварушэньне ва ўсей Радавай Украіне.

На гэтым-жа паседжаньні старшыня Маскоўскага совнаркому (савет народных камісараў) Молатаў заявіў, што савецкая ўлада не прадасьць і не аддасьць Украіны за ніякія скарбы

Пэўне-ж, расейская палітыка ці то манархістычная ці камуністычная ня йдзе па лініі вызваленьня народаў, але прыдзе час і іх аб гэтым ніхто пытацца ня будзе. Адарвецца ад Расеі Украіна, адарвецца і Беларусь.

<u>**J. Bylina.**</u>

MACIEJ. (4)

Ůstaŭ Maciej na zaŭtra rana
Choć i mała ŭčora źjeŭ—
Son ciažki adnak jon mieŭ:
Wot rabota ŭsim razdana
Jon źlez z piečy, łyknuŭ wina,
Hladź, katoraja hadzina?
„Ach, jošć času, lepš prajdusia,
Tak hadzinku, mo druhuju,
Troški nohi paraŭnuju
Dy j da raju pryhladžusia“.
Jdzie Maciej, a dziwaŭ mnoha,
Mo' spatkaje Pana Boha?
Nia widać Jaho nihdzie.
Wot dalej Maciej idzie,
Sciežki z zołata, piaskom
Ůsie pasypany kruhom,
Kala ich ŭsio kraski źjajuć
I haloŭki pachilajuć,
Prad Maciejem usio hnucca,
Da jaho jany śmiajucca.
A Macieju na't zdajecca,
Što i sonca wun śmiajecca:
Miła tak jaho witaje.
Wun i łuh, a wun i rečka,
Tam pastuch pasie awiečki
I na dudcy sabie hraje.
A awiečki, byccam mary,
Ci piarynki, abo chmary,
Ů pawietry ŭsio snujuć,
Nat susim i nie blajuć.
Woŭna śnieżna, čysta biela,
Żałatyja bliščać rohi.
Staŭ Maciej išci niaśmieła,
Pacichutku stawić nohi:
Nadta spudzić ich bajaŭsia.
Až pastuch toj adazwaŭsia:
„Hej, Maciej, čaho baiššia?
Heta, brat aŭcy nia wašy:
Wot ty tolki adaźwisia,
Dyk zabuducca ab pašy,
Prybiahuć usie da ruk“.
Toj pastuch, to byŭ Piatruk.
A Maciej ich zwać bajaŭsia,
Tolki z Piotram prywitaŭsia.
„Jak abied toj smakawaŭ,
Što Boh sam wam hatawaŭ?“
„Ach, moj Piotra, moj mileńki
Heta prosta dziŭny cud“, —
Adazwaŭsia młynar tut, —
„Jak ja byŭ jašče maleńki —
Nawučaŭ ksiondz u kaściele,
Što usim służyć Boh staŭ,
Ja nia wieryŭ i tykiele“ —
Jon na nohać pakazaŭ.
„Moj Maciejka, tak nia možna,
Heta sprawa, bracie, złožna,
Što skazaŭ Boh, dyk i świata,
Daručyŭ Jon mnie awiečki,
Dyk pasu ja ich biaz sprečki“.
„A što hena wun za chata?
Ci jakija tam mury,
Až na henaj wun hary?
Ci nia možna pahladzieć,
Ů muroch tych chto żywieć?“
„Nie, Maciejka, tam nia možna,
Tam addzieł bo jošć taki,
Što żywuć adny żanki“.
„Nu choć troški, aściarožna“.
„Tolki z Božaha prykazu,
A tak, bracie, ani razu.“
„Nu skažy mnie, Piotra, bracie,
Tam na świecie ŭ adnej chacie
Razam žonki i mužčyny
Dy żywuć nia horš skaciny,
A na't časam żywuć świata:
Tut—našto im heta krata?
Ci jakaja tam ściana?
Nu, skažy, na što jana?“
„Ja dziŭluś, što ty pytaješ,
Ci-ž ty bab jašče nia znaješ?
Upuści tut choć jakuju,
Choć-by nawat i światuju,
Dyk tut z raju piekła stanie.
Što rabić tahdy u raju? —
Ja ciabie tut zapytaju.
Što-ž maŭčyš ciapier, waspanie?
Dyj niama susim ŭ tym dziwa,
Heta sprawa sprawiadliwa:
Chto tam lubić zadziracca —
To i tut jaho bajacca.
Znaješ dobra, ty moj bracie,
Jak tam kožna baba ŭ chacie
Miele spraŭna jazykom.
Tut zatoje krucić žorny
I ŭ dabawak chleb jeść čorny
I siadzić až pad klučom“.

„Ach, moj Piotra, ach świacieńki,
Heta-ž ta mučyca cieńka
Iz žančyn wychodzić ruk?
Daj mnie Piotra miłaściwy
Pahladzieć na hety dziwy,
Bo tut čutny młynoŭ stuk.
Widziš, wielmi ja cikawy,
Kab pabačyć heny sprawy,
Jak tam mieluć ŭsio žanki“?
„Ech, Macieju, moj, Macieju!
Mała maješ ty „aleju“
Ů haławie swajoj taki.
I taksama chiba mała
Žonka musić wałkawała,
Jak walcowy dobry młyn.
Ty zabyŭsia ŭžo ab im?
Bo, jak baču, heta sprawa
Dla ciabie jašče cikawa,
Hdzieś snuje u haławie“.
Tak hamoniačy pawoli,
Spacyrujuć sabie ŭ poli.
Čuje Piotra, chtoś zawie.
I biažyć, hladziać, siudy
Chłopčyk šustry i chudy,
I što siły jošć kryčyć:
„Piotra, Piotra, jdzi chutčej,
Nie zabudź uziać klučej
Chtoś u bramu tak stučyć
I tak krepka ŭsio łamočyć,
Znać da raju nadta chočyć“.
„A skažy mnie, u jakuju
Ta asoba bramu bjecca?
Bo ja dobra štoś nia čuju“.
„Mnie, bo, Piotry tak zdajecca,
Što da bab jana žadaje,
Babsku bramu, čuŭ, łamaje“.
„Pačakaj mianie, moj bracie,
Kluč pakinuŭ ja u chacie.
Choć stary, ja spraŭluś chutka:
Za minutku budu tutka“.

(d. b.)

З беларускага жыцьця.

Судовы працэс Галоўнай Управы Т-ва Беларускай Школы. У часе, калі гэта пішам, у Віленскім Акружным Судзе дабягае да канца судовы працэс процiў трох сяброў Галоўнай Управы Т.Б.Ш.,грам. грам.: Ф. Стэцкевіча, Р. Шырмы і Петкевіча, а так-жа Саковіча, Цераха і Скуркі абвінавачаных у праводжаньні пад фірмай Т.Б.Ш. забароненай палітычнай работы. Абвінавачаных бароняць адвакаты: Петрусэвіч, Заштовт-Сукеньніцкая, Повірскер і Шышкоўскі.Аб ходзе самога суду і ягоных выніках падамо абшырную справаздачу ў наступным нумары.

Ужо пачынаецца. Перавядзеньне Віленскай і Навагрздзкай беларускіх гімназіяў леташняй восені ў казённае ведамства мы зразу ўважалі, як першую ступень да заніку беларускага аблічча гэтых гімназіяў, а нават і іх самых як такіх. Гэта наша дагадка пачынае спраўджацца, на жаль, скарэй, як хто спадзяваўся: даведваемся, што з канцом мінулага месяца ні з сяго ні з таго звольнены з гімназіі доўгалетні ейны настаўнік і гімназіяльны лекар Д р. Б. Грабінскі, беларус, а на ягонае мейсца назначаны паляк — нехта Корта. Калі гэткім тэмпам пойдзе дальшае выпіханьне беларусаў з беларускай гімназіі, дык хутка па беларускасьці не астанецца там хіба і духу.— Але ці-ж гэта ня было да прадбачаньня?

Арышты ў Навагрдзкай беларускай гімназіі. Надовячы ў Навагрдзкай беларускай гімназіі паліцыя арыштавала 5-цёх вучняў і 2-юх вучаніц. За чые грахі?

З выдавецкай нівы. З канцом м. м. вышлі з друку месячнікі за м-ц студзень: «Самапомач» № 1 (4) беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопісь і „Шлях Моладзі" № 1 (48). — Дастаць усё можна праз Беларускую Кнігарню „Пагоня", Вільня, Завальная 6—10.

Трагэдыя Беларускага народу

Рыскі трактат падзяліў Беларусь між Расеяй і Польшчай. З часьці Беларусі пад Расеяй маскоўскія камуністы ствралі быццам самастойную Радавую Беларусь, якая палітычна і гаспадарча ўзалежнена бальшавікамі ад Масквы. Заходняя частка Беларусі, якая асталася пад Польшчай, становіць палітычную часьць тэрыторыі польскай дзяржавы, як і этнаграфічная Польшч.

Пасьля гэтага падзелу ў Беларусі пад Расеяй заведзены бальшавіцка-маскоўскі лад, а на беларускіх землях пад Польшчай - цэнтралістычна—варшаўскі лад польскі. Дзяржаўная палітыка на беларускіх землях, кіраваная з дзяржаўных цэнтраў, разьмінулася з жыцьцём Беларускага народу, выклікаючы нездаваленьне сярод беларускага насяльніцтва.

У Зах. Беларусі пад уладай Польшчы паўстае „Грамада", дзейнасьць каторай спыняецца цяжкім прысудам яе павадыроў ,,за шкоднасьць Польшчы." У Ўсх. Беларусі пад уладай Масквы камуністычная ўлада арыштоўвае і высылае з краю „въ отдалённыя мѣста Россіи" беларускіх вучоных і палітычных дзеячоў за іх беларускую дзейнасьць, якая шкодзіла палітычным інтарэсам Масквы.

У апошнія часы акружны суд у Вільні засудзіў б. беларуская пасла ў польскі сойм Б. Тарашкевіча на 8 гадоў катаргі за стварэньне арганізацыі, якая мела быццам на мэце адарваньне Зах. Беларусі ад Польшчы, а надовячы бальшавіцкі суд у Менску засудзіў двух беларускіх студэнтаў: Міхала Бішэвіча і Аляксандра Каўрышына—па 10 гадоў катаргі за тое, што яны належалі да Беларускай Народнай Студэнскай Арганізацыі, якая мае на мэце адарваньне Усходняй Беларусі ад С.С.Р.Р.

Сапраўдная трагэдыя...

З краю.

Наняўся забіць чалавека за 1000 зл. Каля Баранавіч, у вёсцы Радасавец, надовячы забіты заможны селянін Лісік. Сьледзтва выясьніла, што Лісіка забіў Шымчук па намове зяця забітага Шахнуця, які абяцаў Шымчуку за забойства даць 1000 зл. Шахнуць хацеў гэткім спосабам заўладаць гаспадаркай Лісіка ў спадчыне для яго жонкі. Сапраўды дзічэюць людзі.

Тыфус у Валожыншчыне. У Валожынскім павеце паявіўся брушны тыфус, які быццам перакінуўся з Койданаўшчыны (БСРР). Спэцыяльная лекарская камісія выехала на павет і приступіла да барацьбы з заразай.

Рост кнігі ў Нез. Літве.

Віленская літоўская часопісь „Viln. Rytojus" (3.XII.32.) падала цікавы артыкул аб развіцьці літоўскага выдавецтва ў Незалежнай Літве. Галоўныя мяйсцы з гэтага артыкулу падаём ніжэй.

„Кніга — чытаем там — зьяўляецца люстрам культурнага жыцьця народу. Ніхто так ясна і праўдзіва не гавора аб развіцьці ці ўпадку народу, як кніга. Самі людзі і іншыя праявы народнага жыцьця хутчэй гінуць, як кніга... Слушна можна сказаць, што друкаванае слова, кніга, мацнейшае за каменныя ці жалезныя памятнікі. Асабліва ў наш час, калі кніга друкуецца тысячамі экзэмпляраў, сталасьць яе павялічылася значна.

Аб значэньні кнігі для народнай культуры гаварыць ня прыходзіцца. У кнізе, а ня так гдзе-небудзь, знаходзяцца ўсе культурныя здабычы і поступ народу, так-жа доказы яго народнай сьведамасьці. Аб гэтым сьведча і гісторыя літоўскай кнігі.

Сьціслай статыстыкі літоўскай кнігі, асабліва-ж з даўнейшых часаў, ня маем. Прыблізна ад XVI да XVII ст. літоўскіх кніг вышла — 30, ад XVII да XVIII ст. — 60 і ад XVIII да XIX — 160, ад 1801 г. да 1855 — 300, ад 1855 да 1864 — 365.

Ад 1547 г., калі першыя ў літоўскай мове паявіліся кнігі і аж да 1864 г., калі быў літоўскі друк забаронены расейскім урадам, вышла больш як 1000 літоўскіх выданьняў.

Паводле ведамага літоўскага бібліографа Балтромайтіса, ад пачатку літоўскай літэратуры аж да 1904 г. вышла 2665 літоўскіх выданьняў. Весткі гэтыя аднак няпоўныя і лік літоўскіх за гэты час выданьняў значна больш.

Бібліограф В. Біржышка падае гэткую статыстыку літоўскіх друкаў да 1904 г.: у XVI ст. вышла 24 кнігі, XVII — 46, XVIII — 196, XIX — 3,415 (да 1904) і XX — 4, 712 (да 1930) выданьняў.

За час забароны літоўскага друку (1864—1904) вышла 3,281 выданьне. Гэтулькі вышла літоўскіх друкаў, калі хоць і ў няволі адбывалася літоўскае адраджэньне. Як-жа розьніцца лік друкаў з гэтага часу ад часаў старадаўных!

Аднак аж да здабыцьця незалежнасьці літоўская кніга не разьвівалася, як належыцца. Праўдзівы рост яе пачаўся разам з палітычнай незалежнасьцяй Літвы.

Вось як выглядае рост літоўскай кнігі ад пачатку незалежнасьці да нашых дзён. Неперыёдычных выданьняў вышла: у 1919-20 г. — 103, 1921 — 180, 1922 — 190, 1923 — 228, 1924 — 346, 1925 — 471, 1926 — 440, 1927— 428, 1928 — 763, 1929 — 926, 1930 — 961 і ў 1931 — 1,069. Пэрыёдычных выданьняў вышла: у 1919 — 5, 1920 — 38, 1921 — 64, 1922 — 82, 1923 — 90, 1924 — 189, 1925 — 117, 1926 — 154, 1927 — 130, 1928 — 156, 1929 — 165, 1930 — 203 і ў 1931 — 199.

Праз увесь час незалежнасьці, ад 1919 г. да 1931 г., вышла 6,105 тамоў кніг і 1,591 выданьне пэрыёдычнае (газэты, журналы). Знача, за дзесяць гадоў незалежнасьці вышла літоўскіх кніг і агулам друкаў больш, як за час няволі: 1547 — 1904..."

„Кончаючы гэты кароткі агляд росту нашай кнігі, — чытаем урэшце ў ,,Vil. Ryt.", — належа зрабіць наступныя вывады: 1) кніг у нас кожны год выходзіць усё больш, 2) інтэлектуальны ровень краю расьце з кожным годам, 3) сталы рост кнігі паказвае на большае яе запатрэбаваньне і 4) кніга паказвае, што за 1931 г. у Літве быў самы вялікі культурны і інтэлектуальны ўзрост".

Усё вышэй пададзенае аб росьце літоўскай кнігі прыпамінае і Беларусам патрэбу і абавязак папрацаваць над статыстыкай росту беларускай кнігі, а так-жа служа нам жывым прыкладам значэньня для культурнага жыцьця кожнага народу ягонай палітычнай самастойнасьці.

М. К.

З Польшчы.

Картэлі і ўпадак гандлю. Нарады над буджэтам міністэрства промыслу і гандлю выявілі не малую сэнсацыю. Пасол з Б. Б. Мінкоўскі прэфэраваў гэты буджэт. Рэфэрат яго быў больш падобны да праграмы „Левіятана" („Левіятан" гэта саюз польскага цяжкага промыслу і капіталу), чымсь на рэфэрат буджэтны. Пасол Мінкоўскі жадаў зьніжкі платы для работнікаў, скасаваньня соцыяльных забесьпячэньняў (страхоўкі ад хваробы і беспрацоўя) і перастаць дамагацца зьніжкі цэнаў прамысловай прадукцыі.—Гэткая заява пасла Мінкоўскага выклікала нездаваленьне і сярод паслоў Б.Б., асабліва сярод паслоў-работнікаў.

Пасьля рэфэрату Мінкоўскага міністр генэрал Заждіцкі заявіў, што заграгічны капітал у польскім промысьле,у параўнаньні з мінулымі гадамі, цяпер сусім нязначны, а ўчасьце Польшчы ў сусьветным гандлю мінімальнае.

У дыскусіі над экспозэ (заявай) міністра выступілі з крытыкай нават і паслы з Б.Б. Пасол Санойца (Б.Б.) выступіў у вострай форме процiў картэляў, называючы мін. Зажыцкага іхным бацькам. Ён даказваў, што Польшч ёсьць дзяржавай земляробскай, але спружына ў Польшчы накручана на разьвіцьцё промыслу. У канцы дыскусія закончылася тым, што сярод паслоў Б.Б. пачалі курсаваць чуткі аб выступленьні з гэтага клюбу некаторых паслоў.

Выдаленьне студэнтаў з унівэрсытэту. У Варшаўскім унівэрсытэце каля 1000 студэнтаў да Новага Году не аплаціла належнасьці за навуку, а дзеля гэтага пагражае ім выдаленьне з унівэрсытэту. Мін. Асьветы прадоўжыла гэтым студэнтам тэрмін аплаты да 28 студзеня. Але ці гэта памагло — няма ведама.

Безрабоцьце ў Польшчы разрастаецца. За нядоўгі час лік безработных павялічыўся на 11.989 асоб. Усіх безработных налічваецца 255.279 асоб. А колькі іх незапісаных і гэтым самым незалічаных?

З заграніцы.

Сусьветная гаспадарка прад катастрофай. Цяпер усе дзяржавы сьпешна гатовяцца да вялікай сусьветнай гаспадарчай конфэрэнцыі, якая мае вырашаць, што трэба рабіць, каб ўратаваць сусьветную гаспадарку ад развалу. Камітэт знатакоў, які падгатаўляў тэзы для гэтай конфэрэнцыі, даў ужо сваю справаздачу, якая выглядае вельмі сумна:

Безрабоцьце— ва ўсім сьвеце. Прычына гэтаму — нязвычайна ніскія цэны. Цэны збожжа напр. такія ніскія, якіх за 400 апошніх гадоў сусём ня было. Запасы збожжа ў земляробскіх краінах узрасьлі да вялізарных разьмераў. Прамысловая прадукцыя ўпала. Упаў так-жа і гандаль. Некаторыя дзяржавы мусяць плаціць больш грашэй як процант за даўгі, чымсь прадаюць тавараў заграніцу.

Камітэт знатакоў прапануе такі выхад:

1) Скасаваць усе аграгічэньні ў міжнародным гандлю;

2) Зьмяніць спосаб мытнай (цэльнай) палітыкі і мэтад гандлёвых дагавораў;

3) Прыняць пастанову, што дзяржавы адна другой могуць сплачываць даўгі ня толькі грашмі, але і таварамі.

Бяз гэтага катастрофа нямінучая.

Ліга Народаў усё радзіць. Цяпер мае пачацца новая сэсія Лігі Народаў. Галоўная справа гэтай сэсіі — кітайска-японскі канфлікт, а пасьля будзе радзіць аб эканамічных справах. У справе кітайска японскага канфлікту Ліга Народаў бязрадная. Гэты канфлікт вырашыць хіба вайна, якая ўжо так — як і пачалася, а спынілася яна цяпер толькі ад холаду — там вялікія цяпер маразы. На вясну, трэба спадзявацца, разгарыцца яна нанова. — Не ўдаюцца старушцы Лізе і нарады ў справах гаспадарчых. Крызыс пашыраецца і паглыбляецца ўсюды. Дык ніхто ня цікавіцца і гэтай сэсіяй Лігі Народаў.

Бяздомныя і бязпашпартныя ў С.С.Р.Р. Бальшавіцкі лад, разбураючы сям'ю, пусьціў самапасам — без дагляду бацькоў — сотні тысяч дзяцей, якія, не знаючы сваіх бацькоў, а бацькі—іх, бяз ніякага прыпынішча і бацькаўскай апекі, валочацца па вуліцах гарадоў і пасвоему дабываюць сабе пражыўлень-

не. Яны пераважна жабруюць і пахуліганску вымушаюць у праходзячых падачкі — бывае, што гразяць абсыпаньнем вашамі, якіх назьбіраўшы носяць ў скрыначках. Да гэтай арміі бяздомнай дзятвары цяпер далучаецца вялізарная армія ўзрослых бязпашпартных, якія так-жа ня маюць ні хаты, ні ежы, ні адзежы, а да гэтага на дадатак, ня маюць права быць там, дзе хочуць. За нядоўгі час пасьля завядзеньня ў С.С.Р.Р. пашпартоў, бязпашпартных налічваецца ўжо ва ўсім С.С.Р.Р. каля 2 мільёнаў асоб. Гэтых бязпашпартных бальшавікі маюць некуды выселяць. З адной толькі Масквы мае быць выселена 500 тысяч бязпашпартных. Словам, пачынаецца вандроўка народаў.

Зьмена ўрадаў у Нямеччыне і ў Францыі. У мінулую суботу перавярнуліся ўрады ў двух галоўных партнэраў палітычнай ігры ў Эўропе. Падаўся ў адстаўку нямецкі ўрад генэрала Шляйхера і францускі ўрад Поль Бонкур'а.

Гітлер на чале нямецкага ўраду. У панядзелак 30 студзеня с. г. ў Нямеччыне ўтварыўся новы ўрад на чале з Гітлерам, побач каторага, як віцэ канцлер, стаўся фон Папэн.

У **Францыі** новы ўрад утварыўся на чале з прэм'ерам Дэлядіер'ам.

Роспуск Рэйхстагу. У сераду 1 г. м. распушчаны ўзноў нямецкі парлямэнт— рэйхстаг. Новыя выбары назначаны на 5-га сакавіка (марца) с. г.

Бальшавіцкі агент у Ватыкане? Газэты паведамляюць, што з ватыканскай камісіі „Pro Russia" таёмна зьнік ейны дзейны працаўнік, асабісты сэкрэтар старшыні гэтай камісіі архібіскупа Д'Эрбіны, сьвяшч. усх. абр. Аляксандр Дэйбнэр, расеец. — Разам з Дэйбнэрам мелі прапасьці і важныя дакумэнты гэтай камісіі. Дагадваюцца, што А. Дэйбнэр быў падасланы ў Ватыкан бальшавікамі і цяпер праз Бэрлін уцёк да іх назад. Іншыя ўзноў гавораць, што бальшавікі вывезьлі Дэйбнэра з Рыму сілком, як гэта ня так даўна было з ген. Кутеповым.

Так ці гэтак, выпадак Дэйбнэра для Ватыкану нарабіў ня мала хлопату. — Успомніць пры гэтым трэба, што камісіі „pro Russia" падлягае ўся каталіцкая праца над злучэньнем каталіцтва з праваслаўем.

Спроба фашыстоўскага перавароту ў Чэхаславакіі. Прыхільнікі генэрала Гайды надовячы ў Бэрне паднялі спробу фашыстоўскага перавароту. Пераварот ня ўдаўся. Пачаліся масавыя арышты, арыштаваны і сам ген. Гайда.

Дробныя весткі.

Важнае разьясьненьне. Міністр нутр. спраў разьясьніў, што сын гаспадара, калі ён ня мае сваей ўласнай гаспадаркі і працуе ў бацькі, або ёсьць на яго ўтрыманьні, падатак вайсковы мусіць плаціць сам. Бацька за сына гэтага падатку плаціць не абавязаны.

Цукар для сьвіней. Польская цукроўня „Добжэлін", ня маючы дзе дзяваць цукру, зьмяшала яго з мяккім пяском, каб ня елі людзі і шмат таней прадае на корм сьвіней і коняў. Гэты цукар прадае цукроўня па 29 гр. за кілёграм. — Ці ня збыткі гэта?

Вілы, лапаты маюць патанець. Улада напірае на фабрыкі, якія вырабляюць дробныя гаспадарскія прылады — лапаты, вілы і падобныя рэчы, — каб абнізілі на іх цану. Кажуць, што ўсе гэткія прылады маюць моцна патанець.

Ў ВІЛЬНІ.

Вечар славянскай песьні на карысьць безработных адбыўся 1 лютага ў г. зв. малой гарадзкой залі пры Конскай вуліцы. На гэтым вечары выступаў удала і беларускі хор пад кіраўніцтвам грам. Шырмы.

У Віленскай Праваслаўнай Духоўнай Сэмінарыі абвешчана, што расейская мова ня ёсьць ужо прадметам абавязкавага навучаньня, а зьяўляецца толькі мовай патрэбнай дзеля разуменьня расейскіх багаслоўскіх кніжак. І таму хто хоча, можа яе вучыцца, а хто ня хоча, можа ня вучыцца.

Так то так, але гдзе тут канец наказу і пачатак начальніцкага пажаданьня?

Новы Віленскі ваявода. На Віленскага ваяводу назначаны б. Лодзкі ваявода Яшчолт, які прыбыў ужо ў Вільню.

Да нас пішуць.

ЮБІЛЕЙ КОЛАСА І КУПАЛЫ Ў СТАЎПЦОХ.

Стаўпцы. Бел. Дабрадзейнае Таварыства у Стаўпцох ладзіла дня 26 га XII.1932 г. урачыстую Акадэмію з прычыны 50-цілецьця мастакоў беларускага слова: Янкі Купалы і Якуба Коласа. Заля Стаўпецкае воласьці, у якой Акадэмія адбывалася, была перапоўнена народам па берагі. Усе сяляне са Стаўпцоў і з ваколічных вёсак не забыліся аддаць належнае пашаны пяўцом іхняе долі і нядолі.

На праграму Акадэміі зламіліся: 1. Уступнае слова старшыні Дабрадзейн. Т-ва грам. Фабіяна Акінчыца, 2. Рэфэрат аб жыцьці і творчасьці Якуба Коласа, прачытаны быў родным братам паэта Міхасём Міцкевічам. Рэфэрат гэты быў вельмі цікавы, бо ў ім было парушана інтымнае жыцьцё паэта, жыцьцё ў роднай сям'і; гэта адсланіла перад слухачамі тайны творчасьці Я. Коласа, яе стыхію. 3. Рэфэрат аб жыцьці і творчасьці Янкі Купалы прачытаў студэнт У.С.Б. Міхась Тулейка, выказваючы перад прысутнымі чар сонечнае паэзіі гэтага прарока беларускага Адраджэньня. 4. Дэклямацыя твораў Юбілятаў— з якіх найбольш удала выйшлі: „Ужо днее"— дэклямаваны А. Канкалавічанкаю, «Над Нёмнам» К. Галоўкаю і два апавяданьні Якуба Коласа: „Выстагнаўся" і «Недаступны» — дэклямаваныя Міхасём Міцкевічам. 5) Песьні выкананыя хорам з вёскі Старога Сьвержаня пад кіраўніцтвам Гарановіча.

Акадэмія цягнулася каля 4-х гадзін. Усе прысутныя на ёй беларусы сапраўды адчувалі сьвяточны для іх настрой, настрой сонца і цяплыні, што далі ім іх родныя паэты.

Прысутны.

АБ СЯЛЯНСКІМ ЖЫЦЬЦІ.

(*Навагрудчына*).

Нашае сялянства ў апошнія гады шмат пацярпела ад бураў і градабіцьця. Летась град адбіў усю ярыну і зьнішчыў пошар. Цяпер сяляне, ня маючы чым карміць скаціну, прадаюць яе за бязцэн. Зарабіць няма дзе ані граша, нават на соль, або сернікі. Аб іншых „роскашах", як абутак і крамная вопратка нашы людзі ўжо забываюцца. Ня могуць толькі ніяк „забыцца" аб падатках і адміністрацыйных карах— штрафах, бо на гэта ім усьцяж „прыпамінаюць". Выехаў за вароты ня ўкелзаўшы каня, або без таблічкі пры возе і ня дай Божа, спаткае паліцэйскі, пратакол ёсьць, а пасьля і „прыпамненьне" аб штрафе — мандат карны. Бывае ўжо часта, што сяляне „забываюцца" і падаткаў плаціць, але на гэта ёсьць сэквэстратары, якія „прыпамінаюць" і за гэткае „прыпамненьне" яшчэ трэба даплаціць аж 3 зл. А дзе гэта ўсё браць? — ніхто ня кажа, аб гэтым павінен ведаць сам селянін. Дык сяляне розна і дабываюць на гэта ўсё грошы. Адны прадаюць, калі ў каго яшчэ ёсьць, апошнюю худобіну, а іншыя гоняць самагонку. А некаторыя „зарабляюць" і на самагоншчыках: даносяць паліцыі і памагаюць выкрываць браваркі.

Круціцца гэтак жыцьцё нашага сялянства і ня ведама, куды закоціцца. Адны ад другіх хаваюцца з браваркамі, адны другіх шпікуюць, дзе, хто і што робіць, дэмаралізацыя гэтак шырыцца і паглыбляецца, але не бязмэтна, бо кожны гоніцца за так патрэбным грошам, каб заплаціць падатак, за яго „пшыпомнене» штраф, ды каб заспакоіць хоць крыху найпатрабнейшыя вымогі жыцьця.

Аб тым, што ня ўсе гэтыя дарогі пагоні за грошам легальныя і прыстойныя чалавеку шануючаму сваю годнасьць, ніхто ня думае. Турма ўжо не пазор і ня кара. Дзеля здабыцьця так вымаганых грошэй сэквэстратарамі, мандатамі карнымі і жыцьцёвай патрэбай,— дарогі ў нашым народзе робяцца ўсе простымі і ня стыднымі.

Над гэтым аднак трэба прызадумацца, бо гэтакія дарогі могуць завясьці наш народ у такі нерат, што будзе „ні ўзад ні ўперад"— народ здэмаралізуецца дашчэнту.

У першую чаргу аб гэтым павінна падумаць беларуская інтэлігенцыя і неадкладна ўзяцца за арганізацыю нашага сялянства ў коопэрацыю, каб яго ня вызысківалі гандляры, а далей, паказаць дарогу змаганьня з усялякай бядой і шляхі дзеля здабыцьця патрэбнага граша.

Шпак.

СЬВЕДАМАСЬЦЬ ШЫРЫЦЦА.

Вёска Белая, гм. Белавежскай. У прошлым годзе наша моладзь пачала думаць аб тым, як-бы карысьней і весялей правясьці доўгія зімовыя вечары. Вось пачала яна думаць аб сваёй асьвеце і аб падняцьці сябе духова і маральна. Прыпадкова, чытаючы беларускую газэту, яны даведаліся, што можна засноўваць гурток Б.І.Г. і К. і дзякуючы яму можна будзе адчыніць бібліятэку, а нават ладзіць спэктаклі-вечарыны. Гэта надта ўсьцешыла нашу моладзь і яна аб гэтым зусім паважна пачала думаць: выпісала з беларускай кнігарні „Пагоня" статуты і інструкцыі БІГ і К.; пачала думаць аб закладзінах гуртка. Нічога дзіўнага, што паміж моладзьдзю знайшлося шмат такіх, якія баяліся падпісаць дэклярацыі або запісацца ў сябры Інстытуту.

Аднак знайшліся сьмелыя адзінкі: Б. Панько, Я. Панько з вёскі Вілы і Міхась Дацкевіч з Белай, дзякуючы каторым і паўстаў гурток. Гэтая тройка працавала над гэным добрым дзелам прадусім шчыра, не шкадуючы часу і працы. У хуткім часе яны ўцягнулі ў сваю арганізацыю ўсю моладзь з вёскі Белай, арганізуючы сярод сябе гурткі: драматычны і харавы ды адчыняючы бібліятэку. Работа пакульшто йдзе вельмі добра. Грыміць Белая. Урад гуртка ўжо даўно стараўся наладзіць спэктакль-вечарыну. Ня могучы доўга атрымаць дазволу ад старасьва, ён ня спыняў сваёй дзейнасьці і дамагаўся дазволу далей, які ўрэшце і атрымаў на дзень 14-га студзеня с. г., на Новы Год па ст. ст. У гэты вечар былі адыграны дзьве камэдыі: „Боты" і „Птушка шчасьця" Аляхновіча, а пасьля пяялісь беларускія песьні і на канец—скокі да раніцы.

Мне здаецца, што не адзін з чытачоў хацеў-бы знаць, якое ўражаньне зрабіў гэты вечар на беларусоў нашай ваколіцы. Вось я і хачу падзяліцца з паважанамі чытачамі гэтым ўражаньнем.

За некалькі дзён да спэктаклю-вечарыны блізкія і далейшыя вёскі былі павядомлены афішамі. Вечар быў даволі марозны, з вострым ветрам, дзеля чаго нашыя сябры былі надта незадаволеныя, спадзяючыся, што людзей будзе зусім мала. Сталася-ж наадварот. У вызначаны час, а 8 гадзіне ўвечары, людзі пачалі сходзіцца. Прадавец білетаў Арцёмка аж спалохаўся, што ніяк ня можа даць рады. Народу назьбіралася поўнае памешканьне, не хагала мяйсцоў. А людзі ўсё йшлі і ехалі з усіх старон. Урэшце пачуўся голас старшыні: „даволі прадаваць білеты, няма мейсца, рэшта на другі сэанс!" Калі я выйшаў на двор, дык заўважыў, што едзе некалькі параконных фурманак. Я думаў, што гэта паны з надлясьніцтва. Ажно гэта былі нашы людзі з вёсак Вітава і Доўгі Брод (16—19 вёрст ад Белай).

Як на першым, так і на другім сэансе заля была біткам набіта. Усе былі зьдзіўленыя мастацтвам артыстаў, якія, можна сказаць, адыгралі як у фаховым тэатры. Пасьля прадстаўленьня хор пад кіраўніцтвам дзячка надта добра прапяяў некалькі беларускіх „песьняў. Як толькі пачалі пяяць, дык здавалася, што мароз прабягае па жылах: гэтак было прыгожа. Усе прысутныя да глыбіні душы былі крануты сьпевам і прадстаўленьнем. У канцы „Лявоніхай" пачаліся скокі. Па прадстаўленьні прысутныя гаварылі:

„Дык цяпер жыць згодна будзем
Сваркі старыя забудзем,
Шчасьце само, прыдзе яно,
Калі ў згодзе жыць стрываем."

„Праўду кажа гэта песьня:" казалі яны, дык пастараемся жыць у згодзе, кінуўшы сваркі за розную недарэчнасьць і гэтае дзяленьне на партыі, якое да дабра не даводзіць. Калі-ж будзем жыць у згодзе, дык лягчэй нам будзе бароцца з нядоляй. Наагул кажучы, спэктаклям-вечарынай былі здаволеныя ня толькі сяляне, але і паны. Сябры Гуртка БІГіК. былі таксама надта здаволеныя, бо і грошы зарабілі, якія ахвяравалі на бібліятэку і весела і культурна правялі вечар.

Спадзяюся, што на другі спэктакль-вечарыну людзей будзе яшчэ болей. — Надта добра, што некаторыя асобы з пасярод гуртка БІГіК. энэргічна працавалі над гэтым і дзякуючы сваёй працы дабіліся тэй мэты, да якой імкнуліся. Дык пастараймося жыць і працаваць!

Сьвістуноў

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.